Назва ТВП: Сялец

© С. Левый

Код: BY011

Геаграфічныя каардынаты: 52°39' N 24°52' E

Адміністрацыйная прыналежнасць: Брэсцкая вобласць: Бярозаўскі раён

Плошча: 18947 га

Крытэрыі: B2, B3, A4i

Нацыянальны прыродаахоўны статус: частка тэрыторыі з плошчай 7936 гектараў уваходзіць у біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Буслаўка»

Міжнародны прыродаахоўны статус: ТВП міжнароднага значэння, утворана ў 1998 годзе

Агульнае апісанне:

Тэрыторыя ўключае вадасховішча «Сялец», буйнейшы комплекс сажалак рыбгаса (2500 гектараў) з аднайменнай назвай і лясы Ружанскай Пушчы, якія прылягаюць да гэтых штучных вадаёмаў з поўначы. Сярод лясных экасістэм па плошчы пераважаюць хваёвыя лясы і забалочаныя алешнікі ды беразнякі. Даволі значную плошчу займаюць яловыя лясы і ясеннікі, часам сустракаюцца дубравы і грабнякі. Вялікая колькасць паніжэнняў, сухіх грыў, малых рэчак надае лясам Ружанскай Пушчы надзвычайную мазаічнасць. Нізінныя балоты і забалочаныя лугі

размешчаны, у асноўным, у поймах рэк. Частка тэрыторыі балот пакрыта драбналессем.

Праз лясны масіў працякаюць дзве невялікія, з вельмі звілістымі рэчышчамі і павольнай плынню, ракі – Хотава і Радагошч. Акрамя іх тэрыторыю дрэніруюць прытокі Хотавы і, у значна меншай ступені, сістэма каналаў, якая была пракладзена 50-60 гадоў таму назад.

Флора і фаўна заказніка вылучаецца вялікай відавой разнастайнасцю і наяўнасцю значнай колькасці рэдкіх і ахоўваемых відаў раслін (больш за 10 відаў) і жывёл (каля 15 відаў).

Вадасховішча і сажалкі рыбгаса пабудаваны на месцы забалочанай даліны ракі Ясельда, дзе ў апошнюю упадаюць яе прытокі Хатава і Радагошч. На вадасховішчы засталося некалькі вялікіх адкрытых астравоў, вусцевая зона моцна зарасла трыснягом. Вадасховішча і пруды рыбгаса “Сялец” утвараюць самы вялікі на беларусі комплекс прудоў.

Асноўныя біятопы:

Лясы – 55%, сажалкі рыбгаса – 13,3%, вадасховішча – 11%, сельска-гаспадарчыя ўгоддзі – 15%, нізінныя балоты – 5%, іншыя землі – 0,7%.

Птушкі:

На сажалках, дзякуючы наяўнасці вялікіх плошчаў надводнай расліннасці, мноству рыбы і штучных кармоў, склаліся выключна спрыяльныя ўмовы для гнездавання вадаплаўных птушак. Тэрыторыя рыбгаса з’яўляецца месцам гнездавання буйных папуляцый чаплі-бугая *Botaurus stellaris*, нырка-сівака *Aythya ferina*. У паслягнездавы перыяд тут канцэнтруецца больш за 20000 водна-балотных птушак. Найбольш шматлікімі ў гэты час з’яўляюцца лыска *Fulica atra*, качка-крыжанка *Anas plathyrynchos*, вялікі баклан *Phalacrocorax carbo*, шэрая *Ardea cinerea* і вялікая белая чаплі *Egretta alba*. Упершыню для Беларусі тут адзначана малы баклан *Phalacrocorax pygmeus*.

Спалучэнне сажалак рыбгаса і вялікага ляснога масіву стварае выключна спрыяльныя ўмовы для арлана-белахвоста *Haliaeetus albicilla* і пугача *Bubo bubo*. Вялікае значэнне для птушак мае рыбгас і ў перыяд міграцыі. У гэты час на спушчаных сажалках спыняюцца на кармленне тысячныя чароды розных відаў кулікоў, да 20 арланаў-белахвостаў, ад 5 да 15 асобін скапы *Pandion haliaetus*.

Іншыя групы жывел:

З млекакормячых неабходна адзначыць барсука *Meles meles* і наяўнасць пасялення баброў *Castor fiber*. Акрамя іх у заказніку сустракаюцца лось *Alces alces*, алень *Cervus elaphus*, казуля *Capreolus capreolus*, янотападобны сабака *Nyctereutes procyonoides* і выдра *Lutra lutra*.

Стан рэдкіх відаў птушак:

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2000-2010)	Крытерый ТВП
Гусь шэрая *Anser anser*	мг	+	2000-2010	П		
Качка-неразня *Anas strepera*	гн	15-25 п	2005-2008	Э		B2
Качка-шылахвостка *Anas acuta*	гн	+	2000-2010	П		
Нырок-сівак *Aythya ferina*	гн	200-300 п	2005-2008	Э		B3
Савук-луток *Mergus albellus*	мг	+	2000-2010	П		
Савук вялікі *Mergus merganser*	мг	+	2000-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2000-2010)	Крытерый ТВП
Коўра шэрашчокая *Podiceps grisegena*	гн	+	2000-2010	П		
Чапля-бугай *Botaurus stellaris*	гн	20-40 с	2005-2008	Э		B2
Чапля-лазянік *Ixobrychus minutus*	гн	1-5 п	2008	Э		
Чапля вялікая белая *Casmerodius albus*	гн	5-10 п	2005	Э		
Чапля вялікая белая *Casmerodius albus*	мг	100-250 ас	2000-2010	Э		A4i
Чорны бусел *Ciconia nigra*	гн	+	2005-2008	П		
Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla*	гн	4-6 п	2005-2008	Э		B2
Малы арлец *Aquila pomarina*	гн	+	2000-2010	П		
Скапа *Pandion haliaetus*	гн	5-15 ас	2000-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2000-2010)	Крытерый ТВП
Сокал-кабец *Falco subbuteo*	гн	+	2000-2010	П		
Пагоніч малы *Porzana parva*	гн	+	2000-2010	П		
Журавель шэры *Grus grus*	гн	3-5 п	2010	Э		
Зуёк вялікі *Charadrius hiaticula*	мг	+	2000-2010	П		
Баталён *Philomachus pugnax*	мг	+	2000-2010	П		
Грыцук вялікі *Limosa limosa*	мг	+	2000-2010	П		
Кулён вялікі *Numenius arquata*	гн?	+	2000-2010	П		
Кулік-селянец *Tringa nebularia*	мг	+	2000-2010	П		
Чайка малая *Hydrocoloeus minutus*	мг	+	2000-2010	П		
Чайка шызая *Larus canus*	мг	+	2000-2010	П		

Віды	Статус	Колькасць	Год/перыяд ацэнкі	Дакладнасць ацэнкі	Трэнды (2000-2010)	Крытерый ТВП
Рыбачка белашчокая *Chlidonias hybrida*	мг	+	2000-2010	П		
Пугач *Bubo bubo*	гн	1-3 п	2005-2008	Д		
Кугакаўка барадатая *Strix nebulosa*	гн	2-3 п	2005-2008	Д		
Сініца вусатая *Panurus biarmicus*	гн	+	2000-2010	П		

Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Звяры: зубр *Bison bonasus*, рысь *Lynx lynx*, барсук *Melesmeles*.

Расліны: баранец звычайны *Huperziaselago*, сон лугавы *Pulsatillapratensis*, кураслеп лясны *Anemonesylvestris*, гарлачык белы *Nymphaeaalba*, зубніца клубняносная *Dentaria bulbifera*, лілея кучаравая *Lilium martagon*, тайнік яйцападобны *Listera ovata*, касач сібірскі *Iris sibirica*, шпажнік чарапіцавы *Gladiolus imbricarus* і інш.

Пагрозы:

Лясныя экасістэмы:

- суцэльныя рубкі на вялікіх паверхнях і у месцах гнездавання рэдкіх, у першую чаргу драпежных птушак;
- так званае прыбіранне лесу ад захламлення і вырубванне сухастою. Прыводзіць да змяншэння колькасці мертвага дрэўна і добрых месц гнездавання для многмх відаў птушак;

- Водныя экасістэмы:
- позднія тэрміны напаўнення сажалак і значныя ваганні узроўню вады пад час гнездавога сезону вядуць часам да значнай гібелі гнёзд;
- веснавое паляванне і на рыбгасе і на вадасховішчы з’яўляецца моцным фактарам беспакойства;
- знішчэнне надводнай расліннасці без уліку экалагічных патрабаванняў асабліва ў веснавы і летні перыяды, прыводзіць да знішчэння гнёзд;
- каранная рэканструкцыя ложа прудоў з поўным вынішчэннем надводнай расліннасці. Вядзе да знішчэння месцаў гнездавання вялікай колькасці рэдкіх птушак.
- павышаная рэкрэацыйная нагрузка, асабліва у гнездавы сезон май-ліпень;
- Балотныя экасістэмы:
- зарастанне балот хмызняком;
- асушальная меліярацыя;

Рэкамендацыі па захаванню:

- вызначэнне месцаў гнездавання ахоўваемых лясных відаў птушак і перадача іх пад ахову;
- поўная забарона на выдаленне мёртвага дрэўна ў лясах, а таксама на вырубку пашкоджанных і дуплістых дрэў;
- вызначэнне і перадача пад ахову з абмежаваннем рэжымам гаспадарання, найбольш важных месцаў гнездавання ахоўваемых птушак на рыбгасе “Сялец”;
- арганізацыя маніторынгу ТВП утвараючых відаў, а таксама іншых найбольш рэдкіх відаў;
- поўная забарона на веснавое паляванне на рыбгасе і вадасховішчы;
- вызначэнне месцаў спакою на вадасховішчы з поўнай забаронай палявання.

Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Абрамчук А.В.

Абрамчук А.В., Абрамчук С.В. Большая белая цапля в Беларуси: распространение и экология. // Беркут. Т. 14, вып. 1. 2005. S. 50-55.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Астроўскі А.А., Грычык В.В., Казулін А.В., Міндлін Г.А., Парэйка А.А., Цішачкін А.К., Юрко В.В.)

Складальнікі : Абрамчук А.В.

** Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*